Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для іспыту па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 19. Варыянт 6. Ч.1**

**Білет № 19. Практычнае заданне. Наш край у XIII-XVIII стст.**

**Распрацоўнік заданняў:**Ларыёнаў Вячаслаў Анатольевіч, ДУА «Ціманаўская сярэдняя школа Клімавіцкага раёна»

**На аснове прадстаўленых матэрыялаў адкажыце на пытанні.**

1. З апорай на крыніцу 1.(3-4) Калі і кім гораду Магілёву было дадзена Магдэбургскае права?
2. *З апорай на крыніцу 1.* (5-6) Пералічыце правы і абавязкі, якія мелі грамадзяне, якія атрымалі магдэбургскае права.
3. *З апорай на крыніцу 2.* (7-8) Падлічыўшы беларускія гарады, якія атрымалі магдэбургскае права да канца XVI ст., зрабіце выснову аб распаўсюджванні магдэбургскага права на беларускіх землях у дадзены перыяд.
4. *З апорай на крыніцу 3,*(9-10) Разгледзьце фрагмент гравюры і вызначыце, якія будынкі, акрамя ратушы, мог паказаць на ёй аўтар.

**Крыніца 1**

**Гісторыя Магілёва: Магдэбургскае права**
**Прывілеем Стэфана Баторыя, вялікага князя літоўскага і караля польскага, на Магдэбургскае права гораду Магілёву было даравана 28 студзеня 1577 г.**

Магілёў атрымаў права на самакіраванне. Мяшчане вызваляліся ад падсуднасці каралеўскіх чыноўнікаў. Улада ў горадзе перайшла ў рукі магістрата (рады), які складаўся з бурмістраў, "радцаў" (дарадцаў), "лаўнікаў" (засядацеляў) "іншых асоб урадавых". Да 1636 г. магістраў абіраўся ў двух, а затым у пяці складах (зменах), кожны з якіх на працягу 1 года кіраваў горадам. На чале гарадскога ўпраўлення стаяў войт, які прызначаўся каралём пажыццёва з ліку буйных феадалаў.
Да сярэдзіны XVII ст. магілёўскія войты не пражывалі ў горадзе, з'яўляліся ў ім толькі зрэдку, усімі справамі ў горадзе ведалі іх наменікі - стужвойты, якія да 1580 г. прызначаліся войтамі, а затым сталі абірацца гараджанамі. У 1588 г. гарадскія масы Магілёва дамагліся стварэння пры магістраце кантрольна-дарадчага органа з 12 «прысяглых паспалітых», якія абіраліся штогод з ліку гараджан.
"Паспалітыя" абавязаны былі сачыць за правільным выкарыстаннем гарадскіх сродкаў, разам з магістратам удзельнічаць у вырашэнні розных пытанняў жыцця горада. З даваннем магдэбургскага права Магілёву дазволілі

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

пабудаваць ратушу, яму быў падараваны герб: на блакітным полі каменная вежа. Горад атрымаў права на 2 кірмашы за год.

**Крыніца 2.**

Картасхема горада Беларусі ў XVI ст.




**Крыніца 3**

**Гравюра "Магілёў у XVI ст."**

